# Шахматная Каралева

Кацярына Хадасевіч—Лісавая



Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

# ШАХМАТНАЯ КАРАЛЕВА

казкі

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*Серыя заснавана ў 2023 годзе*

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 010

**Хадасевіч-Лісавая, К. С.**
Шахматная каралева : казкі / Кацярына Хадасевіч-Лісавая. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 28 с. (Электронная бібліятэка).

У электронную кнігу ўвайшлі казкі вядомай пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой “Загадка прынцэсы Агнэсы”, “Пачастунак для Яго Вялікасці” і “Шахматная каралева”.

© Хадасевіч-Лісавая К. С., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2023

# Загадка прынцэсы Агнэсы

Гэта казка — сапраўдная машына часу, бо яна здольная адправіць сваіх чытачоў у глыб стагоддзяў. Той, хто хоча здзейсніць дзівоснае падарожжа, павінны ўважліва чытаць і ўяўляць тое, пра што я распавяду. Добрая фантазія прама цяпер пераносіць вас у раскошны каралеўскі палац. У вялікіх залах мітусяцца слугі, усе рыхтуюцца да Дня народзінаў юнай прынцэсы Агнэсы. Гасцей чакаецца шмат! З’едуцца розныя каралі, прынцы, імператары, цары… А ўсё таму, што адбудзецца не толькі Дзень народзінаў прынцэсы, але і агледзіны. Тата-кароль задумаў аддаць адзіную дачушку замуж. Маўляў, ён старэе, а так хоча ўнукаў дачакацца, каб ведаць, хто пасля будзе дзяржавай кіраваць. А дзяржава яго магутная, вялікая і багатая. Нават калі б так здарылася, што ў караля зусім непрыгожая дачка, то жаніхі б усё адно ў вялізную чаргу сталі, абы такія валоданні прыдбаць. Але прынцэса была прыўкраснай, стройнай, разумнай. Хто ж не захоча мець такую жонку ды яшчэ з багатым пасагам? Вось і з’язджаліся ў госці ўсе-ўсе халастыя каралі, прынцы, імператары, цары…

— Сумна мне, Праменьчык! — уздыхала Агнэса, гладзячы свайго любімага белага каня. — І чаму ў прынцэс такі лёс? Я хачу, каб мой жаніх кахаў мяне, а не мой пасаг, каб марыў мець вялікую сям’ю, а не вялікую дзяржаву, каб ён быў разумны, вясёлы, шчыры. Як знайсці яго, адзінага, сярод мноства прэтэндэнтаў? Хіба такую складаную загадку ім загадаць, каб толькі самы-самы і змог яе разгадаць.

Конь радасна фыркнуў і заківаў галавой.

— Што, Праменьчык, добра я прыдумала? — усміхнулася Агнэса.

Конь зноў зафыркаў і заківаў, быццам менавіта гэта і хацеў сказаць сваёй гаспадыні.

— Паедзем катацца! — ласкава сказала прынцэса каню і гучна загадала слугам: — Рыхтуйце збрую! Мы з Праменьчыкам пагуляць надумалі.

У той жа момант з’явіўся грум[1]. Юнак пачціва пакланіўся прынцэсе і выканаў яе загад. А калі яна паскакала на сваім улюбёнцы праз квяцісты луг, грум суправаджаў яе, едучы на буланым кані паводдаль.

Хоць і не ўмеў Праменьчык размаўляць, але падказаў сваёй гаспадыні загадку, якая была б па сілах толькі разумнаму і кемліваму чалавеку.

Назаўтра ў палац з’ехалася шмат гасцей. І кожны з іх імкнуўся з прынцэсай пагаварыць, на танец запрасіць, побач пастаяць, падарункамі здзівіць. У Агнэсы аж галава закружылася ад такой увагі. Баль быў раскошны. Госці частаваліся, танчылі, спявалі і як маглі імкнуліся запомніцца і спадабацца прынцэсе. А напрыканцы ўсе чакалі, каго яна абвесціць сваім выбраннікам. Кароль падзякаваў гасцям за ўвагу і даў слова любімай дачушцы. З заміраннем сэрцаў усе чакалі, чыё імя вымавіць прыгожы голас прынцэсы.

— Дзякую ўсім за віншаванні, танцы, падарункі! — пачала гаварыць Агнэса. — Я хацела б і парадаваць тату, і назваць аднаго з вас сваім жаніхом, але зрабіць выбар вельмі няпроста. Абяцаю выйсці замуж за таго, хто выканае маё заданне. Я асоба рамантычная, таму хачу, каб мой жаніх заваяваў маё сэрца. Для гэтага яму неабходна… выйграць вайну!

Усхваляваны шэпт пранёсся па зале. Каралі, прынцы, імператары і цары ўстрывожыліся такой прапановай.

— Маім жаніхом стане той, хто пераможа ў вайне. Распачаць яе давядзецца заўтра на досвітку.

— З кім ваяваць? — гучалі галасы самых адважных прэтэндэнтаў у жаніхі.

[1] Грум — слуга, які суправаджае вершніка ці экіпаж.

— З варожым войскам, — адказала прынцэса. — Ваяваць вам давядзецца седзячы і моўчкі. Няхай у вашых салдат не будзе ні штыкоў, ні стрэльбаў, а біць яны будуць наўскасяк.

— На што здатныя такія салдаты? — зашумелі каралі, прынцы, імператары і цары. — Так ваяваць немагчыма!

— Там, дзе адбудзецца гэты бой, — магчыма! — упэўнена сказала Агнэса.

— І дзе ж гэта? — запыталіся ахвочыя стаць жаніхом прынцэсы.

— Бой пройдзе на полі, дзе ў клетках томяцца дзіўныя жывёлы — коні без капытоў і сланы без хобатаў.

— Якое страхоцце! — гучала з натоўпу. — І што з гэтымі калекамі рабіць?

— Той, хто захоча перамагчы, павінен будзе з'есці варожага каня і закусіць сланом, — патлумачыла прынцэса.

Каралі, прынцы, імператары і цары моўчкі лыпалі круглымі ад здзіўлення вачыма.

— Яшчэ ў вашым узбраенні будзе ладдзя, — падказала Агнэса.

— Ладдзя на полі? Ваша Вялікасць, вы нічога не пераблыталі? — запытаўся стары сусед-імператар, які таксама вельмі хацеў ажаніцца з юнай прынцэсай і атрымаць магутную дзяржаву ў дадатак.

— Не пераблытала, гэта ладдзя даволі хутка рухаецца па полі, хаця нават вёслаў не мае, — запэўніла Агнэса.

— Такая незвычайная вайна, што нельга не спытацца: «А што трэба зрабіць, каб перамагчы?» — выгукнуў касавокі прынц далёкай краіны.

— Прабіць абарону і захапіць чужога караля! Але бойцеся яго каралевы, яна магутная і дужая! — гучна абвясціла прынцэса і дадала: — Як толькі вы здолееце ўзяць у пастку чужога караля, над полем прагучыць: «Кароль загінуў!» На гэтым вайна скончыцца, за пераможцу я і выйду замуж!

Зноў загаманілі разгубленыя каралі, прынцы, імператары і цары. Некаторыя з іх напружана разважалі над пачутым, некаторыя чухалі патыліцы і думалі, дзе шукаць тое поле, некаторыя вырашылі, што нават дзеля прыўкраснай прынцэсы разам з багатым пасагам не гатовыя яны пайсці ў такі жудасны бой.

— Вар'ятка! На полі бітвы сланы з адарванымі хобатамі і коні без капытоў… Каня з'есці, сланом закусіць! Сухапутная ладдзя… Прынцэса з глузду з'ехала! Я такую жонку браць перадумаў! — пацiснуў плячыма стары сусед-імператар і адразу выправіўся дадому.

Прынцэса Агнэса з палёгкай уздыхнула, бо ніяк не хацела замуж за такога жаніха. А астатнім абвясціла:

— Заўтра на досвітку чакаю таго, хто ведае, дзе згаданае мной поле бітвы і войска. Дабранач, дарагія госці!

Раніцай у каралеўскі палац ніхто не прыйшоў, бо так і не здагадаліся, з кім ваяваць і на якім полі біцца. Каралі, прынцы, імператары і цары сабраліся каля палаца, каб паглядзець, ці знойдзецца той, хто выканае дзіўнае заданне прынцэсы.

— Бачыш, татачка, няма сярод гэтых прэтэндэнтаў ніводнага разумнага і кемлівага жаніха! — уздыхнула Агнэса.

— Занадта цяжкае заданне ты задала! — усміхнуўся кароль.

— Але ты, тата, адразу зразумеў, што я загадала? — прыжмурылася прынцэса.

— Я, вядома, здагадаўся. Але як жа мы цяпер мужа табе абяром? Сярод каралёў, прынцаў, імператараў і цароў не знайшлося такога ж кемлівага, як ты, мая разумнічка.

— Можа, пашукаць у народзе? — прапанавала Агнэса.

— Простага чалавека? — здзівіўся кароль. — Калі высакародныя жаніхі не рашылі тваю задачу, хіба простыя людзі здагадаюцца?

— Вось і праверым! — сказала прынцэса.

І кароль адправіў вяшчальнікаў з заданнем Агнэсы да простага народу. Не паспелі каралі, прынцы, імператары і

цары здзівіцца такому загаду, як да ганка каралеўскага палаца падышоў юнак і пастукаў у цяжкія дзверы. Высакародныя жаніхі скасавурыліся на яго, зашапталіся. На балкон, які быў прама над ганкам, выйшла Агнэса.

— Чаго стукаешся? — запыталася яна.

— Гатовы змагацца за вас у вайне, Ваша Вялікасць! — адказаў юнак.

— У той самай вайне, пра якую я гаварыла? — удакладніла прынцэса.

— Так, Ваша Вялікасць! — запэўніў ён.

— З кім будзеш ваяваць? Выбірай! — сказала Агнэса.

— Пэўна, не змагу знайсці саперніка больш сур’ёзнага за вас, мая прынцэса! — пакланіўся юнак.

— Ён збіраецца ваяваць з прынцэсай! Вар’ят! Кароль зараз жа зніме з плячэй яго бязглуздую галаву! — зашапталіся каралі, прынцы, імператары і цары.

Як жа яны здзівіліся, калі кароль у адказ на такую дзёрзкую прапанову толькі ўсміхнуўся і згодна кіўнуў галавой. І прынцэса Агнэса ў суправаджэнні бацькі тут жа спусцілася на ганак. Не міргаючы ўсе сачылі за тым, што тут зараз адбудзецца.

— Пачнём бітву? — усміхнулася прынцэса. — Якое войска выбіраеш? Чорнае ці белае?

— Няхай гэта вызначыць спадар Рандом! — адказаў юнак.

Усе каралі, прынцы, імператары і цары азіраліся па баках, шукаючы вачыма таго спадара Рандома. А тым часам юнак працягнуў прынцэсе рукі, заціскаючы нешта ў далонях. Без аніякага здзіўлення Агнэса паказала пальчыкам на правую руку хлопца-дзівака.

— У вас войска белае, Ваша Вялікасць! — адказаў юнак, зазірнуўшы ў сваю далонь.

— Пачынаем бітву! Выводзім войскі! — абвясціла прынцэса.

Юнак расхінуў торбу, што вісела на яго плячы, і дастаў адтуль драўляную скрыню. І як толькі пабачылі яе каралі, прынцы, імператары і цары, то адразу зразумелі, што за загадку задала ім прынцэса. Полем бітвы, на якім меўся адбыцца бой, была шахматная дошка. На яе клетках з’явіліся сланы без хобатаў і коні без капытоў, роўным радам сталі салдаты-пешкі, якія сапраўды не маюць зброі і б’юць наўскасяк. Тут жа была і ладдзя без вёслаў, ну і, вядома, кароль з каралевай.

Прынцэса і хлопец-дзівак распачалі гульню. Ваявалі яны насамрэч моўчкі і седзячы. Па дошцы рухаліся фігуры. Каралі, прынцы, імператары і цары толькі і чакалі, хто ж скажа запаветнае: «Кароль загінуў!», ці, як належыць у шахматнай партыі, «шах і мат!»

Доўга працягваўся гэты бой, сапернікі былі аднолькава дужыя. Не ўдалося каралям, прынцам, імператарам і царам пабачыць здалёк, хто чыйго каня з’еў і сланом закусіў. Не прагучала і «шах і мат!» У гэтай партыі была нічыя.

— Хто ты, юнак, якога не здолела абыграць мая дачка? — запытаўся кароль.

— Ян, грум з вашай стайні, Ваша Вялікасць! — пакланіўся хлопец.

— Дзе навучыўся ты так гуляць у шахматы, Ян? — запыталася Агнэса.

— З маленства з татам за дошкай з чорна-белымі фігурамі вечары бавіў, — патлумачыў грум.

— Як і мы! — ласкава ўсміхнулася прынцэса, тулячыся да свайго бацькі.

— Калі спадабаўся ты маёй дачцэ, то я дам згоду на шлюб! — гучна сказаў кароль.

Зараз усе позіркі скіраваліся на Агнэсу. Яе шчокі заірдзеліся, доўгія вейкі апусціліся, хаваючы вочы.

Насамрэч яна адразу пазнала грума са стайні. З дзяцінства бачыла яго, непрыкметна назірала, як хлопец скакаў за ёй паводдаль падчас яе конных прагулак. І яе

любімага Праменьчыка Ян сумленна даглядаў, конь давяраў яму. А так бывае толькі тады, калі чалавек добры — жывёлы гэта адчуваюць.

— Разумны, кемлівы… спадабаўся… — прашаптала бацьку Агнэса.

— Прынцэса выходзіць замуж! — абвясціў кароль. — Рыхтуемся да вяселля!

Ян стаў на адно калена і пацалаваў руку сваёй нявесты.

— Просты грум атрымаў у жонкі прынцэсу, багацце і вялікую дзяржаву! — нягучна сказала Агнэса. — Ты, пэўна, вельмі рады такой удачы!

— Мая нявеста падабаецца мне даўно. Яе пасаг не мае для мяне значэння, я буду шчаслівы мець вялікую сям'ю, а не дзяржаву, — адказаў Ян.

І прынцэса Агнэса зразумела, што сустрэла жаніха, пра якога марыла.

На іх шыкоўным вяселлі гуляла ўсё каралеўства. Гасцямі сталі і ўсе каралі, прынцы, імператары і цары, якія толькі ўздыхалі, зайздросцячы простаму груму. Апроч таго, усе яны захацелі навучыцца гуляць у шахматы, бо даведаліся, што гэта гульня робіць чалавека разумным і кемлівым. І ўвогуле, у жыцці такое ўменне можа спатрэбіцца.

# Пачастунак для Яго Вялікасці

Адбылася гэта гісторыя ў старадаўнія часы ў адным дзівосным каралеўстве. Уладарыў там стары кароль, які стаміўся за доўгае жыццё кіраваць і марыў пра адпачынак. Нарэшце яго адзіны сын Стэфан дасягнуў узросту, калі яму можна было перадаць дзяржаву, і вярнуўся з-за мяжы, дзе вучыўся. З радасцю бацька саступіў трон свайму нашчадку і папрасіў яго хутчэй ажаніцца, каб працягнуўся іх каралеўскі род, каб было каму праз некаторы час даверыць багатую спадчыну.

— Толькі ж ты ўважліва жонку выбірай, каб не пакутаваў, як я! — даў параду стары кароль.

А справа была вось у чым. Першая жонка караля — маці маладога ўладара — адышла ў лепшы свет, пакінуўшы зусім маленькага сыночка. Шмат гадоў заставаўся самотным несуцешны кароль, а потым яго міністры вымусілі ўзяць новую жонку. Маўляў, не можа кароль адзін век векаваць, павінна ў краіне быць першая лэдзі — і кропка. Яны нават нявесту знайшлі, якая яму вельмі падыходзіць. У яе багаты пасаг, патрэбныя сувязі, моцная падтрымка. Кароль пагадзіўся, нават не пацікавіўшыся асобай прэтэндэнткі. Прыехала да яго нявеста з далёкай краіны. Знешне прынцэса была прывабная, усміхалася, любую гутарку магла падтрымаць. Міністры запэўнілі, што яна падыходзіла манарху. Зладзілі пышнае вяселле, і ўзялася каралева ў палацы гаспадаркай кіраваць. Прыслужніцы па яе загадзе ў халасцяцкім жытле ідэальны парадак навялі, утульнасць з’явілася, паўсюль вазы з кветкамі, карціны прыгожыя, заморскія птушкі ў клетках спяваюць. Гэта каралю спадабалася, але быў іншы бок гаспадаркі — кухня. І там каралева свае законы ўвяла. Стравы яе роднай краіны вельмі адрозніваліся ад мясцовых. І цяпер кухары гатавалі толькі па рэцэптах новай гаспадыні. І ніхто, нават сам кароль,

не мог закамандаваць нешта мяняць. Да стала падавалі смажаных жабак, марынаваных смоўжыкаў, печаных пацучкоў, салёных конікаў, вэнджаных кажаноў… Кароль нічога з такіх прысмакаў і пакаштаваць не згаджаўся, таму ўжо некалькі гадоў еў толькі хлеб, кашу ды тое-сёе з гародніны.

Вось сыну свайму і параіў:

— Да нявесты добра прыглядайся, Стэфан, прыгожую шукай, з характарам спакойным. І пра густы ў ежы даведайся! Ты жонку выбірай такую, каб яна цябе смачна карміла! Не чакай, пакуль міністры табе якую прынцэсу заморскую сасватаюць! Паездзі па краіне, знойдзецца твая суджаная.

Паслухаўся малады кароль бацьку і выправіўся ў падарожжа. Нездарма кажуць, што і ў сцен вушы маюцца. Невядома як, але пайшла пагалоска, што ўладар дзяржавы не проста так вандруе, маўляў, шукае нявесту і абярэ тую, што смачна яго накорміць. У кожным заможным маёнтку рыхтаваліся сустрэць важнага госця. Напагатове былі лепшыя кухары, закуплены адмысловыя пачастункі, распрацаваны самыя дзівосныя рэцэпты. Якіх толькі страваў не прапаноўвалі каралю! І, ведаючы традыцыі каралеўскай кухні апошніх гадоў, на стол падавалі тых жа смажаных жабак, марынаваных смоўжыкаў, печаных пацучкоў, салёных конікаў і вэнджаных кажаноў. На ўсялякі выпадак ставілі і мясцовыя стравы, прапаноўвалі лепшыя напоі. Малады кароль частаваўся, дзякаваў за гасціннасць і ехаў далей.

— Эх, няпроста нявесту знайсці! — уздыхаў ён, пакідаючы чарговы маёнтак. — Каб я толькі пажаданні страўніка ўлічваў, то даўно б выбраў сабе жонку. А я сэрца сваё слухаю. Толькі яно чамусьці маўчыць і не адгукаецца ні на ўсмешкі прыгожых паненак, ні на іх кулінарныя таленты.

…У багатай княжацкай сядзібе, дзе гэтым разам спыніўся кароль, быў накрыты самы раскошны стол. Важнага госця пасадзілі побач з маладой князёўнай, налівалі куфлі віна і кармілі ўсім, што стаяла на стале. Гаспадары так стараліся дагадзіць, што вырвацца з такой аблогі гасціннасці ў караля

проста не атрымлівалася. Яго накармілі так, што небараку здавалася, ён вось-вось лопне. Князёўна, што сядзела побач, замест удзелу ў гутарцы ўвесь час толькі залівіста хіхікала, выдаючы такія высокія ноты, што няшчасны кароль не мог больш вытрымліваць такі гук. Скарыстаўшы момант чарговай змены страў, калі гаспадары на хвіліну выйшлі, высокі госць проста скочыў у адчыненае акно. Залівісты смех перайшоў у залівісты плач на тых жа неверагодна высокіх нотах. Кароль паімчаў з усёй магчымай у такім «наетым» стане хуткасцю да найбліжэйшага лесу, каб схавацца. Збег, нават не забраўшы са стайні свайго каня!

Вечарэла. На свежым паветры і ў цішыні закормлены ледзь не да паўсмерці ўладар дзяржавы клэпаў па лясных сцяжынках, трымаючыся за жывот.

— Яшчэ аднаго такога гасціннага прыёму я проста не перажыву! Трэба вяртацца ў палац, няхай міністры мне нявесту шукаюць! — уздыхнуў Стэфан.

Кароль дайшоў да ракі, памыў халоднай крыштальнай вадой твар, прылёг на беразе адпачыць і падумаць, дзе ж пераначаваць. Ніколі не даводзілася яму спаць на вуліцы, але была цвёрдая ўпэўненасць, што лепш начлег пад адкрытым небам, але ў княжацкі маёнтак нізавошта не вернецца.

— Што, чалавеча, заблукаў ці здарылася нешта? — пачуў ён голас.

Кароль сеў, надзеў на галаву карону і агледзеўся.

— Ваша Вялікасць?! — пачціва і са здзіўленнем прамовіў той самы голас.

Уладар дзяржавы ўбачыў непадалёк ад сябе сталага мужчыну.

— Некаторая недарэчнасць адбылася! Я застаўся без свайго вернага каня і без магчымасці пераначаваць у больш ці менш зручных умовах! — усміхнуўся кароль.

— Дазвольце мне, простаму млынару, прапанаваць вам мой сціплы дом! — сказаў выпадковы сустрэчны.

— Буду ўдзячны! — узрадаваўся ўладар дзяржавы.

Яны пайшлі берагам ракі і ўжо ў прыцемках дабраліся да старога вадзянога млына. Дом быў сапраўды сціплы. На ганак сустракаць млынара выбегла яго дачка. Пабачыўшы нечаканага госця, сумелася, злёгку схіліла галаву, схаваўшы пад доўгімі цёмнымі вейкамі прыгожыя вочы.

— Мая дачка Мар'яна! — прадставіў гаспадар. — Мы ўдваіх жывём.

— Добры вечар, Ваша Вялікасць! — павіталася дзяўчына.

— Прабачце за позні і нечаканы візіт! — усміхнуўся кароль.

Госця запрасілі ўвайсці, уладкавалі ў лепшым фатэлі.

— Дачушка, што ў нас на вячэру? Яго Вялікасць накарміць трэба! — сказаў млынар.

— Не-не-не! — узрушана адмовіўся госць. — Вячэраць я не буду! Дзякую, але я лепш адразу спаць пайду.

Уладару дзяржавы ў сціплым доме прапанавалі звычайны драўляны ложак з палатняным матрацам, набітым духмянай травой, такой жа падушкай і саматканай коўдрай. Стомлены кароль заснуў адразу, толькі галаву паклаў.

А гаспадар і яго дачка ціха размаўлялі ў сенцах.

— Пашчасціла, што госць ад вячэры адмовіўся! — сказаў млынар. — Мне сёння на паляванні зусім не пашанцавала, нічога не здабыў! Чым бы мы яго кармілі? Хаця прыйдзе раніца, і сняданак трэба будзе падаць. І каму?! Каралю! А ў нас поўная галеча! Што рабіць? Не знасіць мне галавы за такі прыём!

— Не турбуйся, татачка! Я нешта прыдумаю. Слоік малака ёсць, я днём у лесе суніц ды чарніц набрала, — супакойвала Мар'яна.

— Малако ды ягады… пакарае лютай смерцю! — бедаваў гаспадар. — Ён да такіх прысмакаў прывык! Яму так выкшталцона падаюць!

— Кладзіся спаць, а пра сняданак я паклапачуся! Будзе смачна і выкшталцона. Абяцаю! — запэўніла дзяўчына.

Бацька павохкаў, паўздыхаў ды пайшоў спаць, а Мар’яна рушыла на кухню. Акрамя ягад і слоіка малака быў у гаспадыні цукар і колькі мукі. Млын жа ўсё-ткі! Хоць апошнім часам проста не было з чаго муку рабіць. Распаліла дзяўчына печ, дастала апошнія запасы і ўзялася за справу.

Раніцай падала яна бацьку духмянай гарбаты і невялічкі бохан хлеба.

— Дзякую, дачушка! А караля ёсць чым пакарміць? — перажываў млынар.

— Ёсць! — усміхнулася Мар’яна.

Яго Вялікасць выйшаў з пакоя.

— Як хораша мне спалася! Пэўна, з дзяцінства такога салодкага сну не было! — сказаў кароль.

— Сціплы пакой, просты ложак. Пэўна, у матрацы ўся справа! — разважаў услых гаспадар. — Гэта Мар’яна напоўніла яго духмянымі кветкамі-травамі. А цяпер запрашаем вас паснедаць!

— Калі толькі зусім крыху, я не паспеў прагаладацца! — адказаў госць.

— Вашу Вялікасць не здзівіш аніякімі стравамі, хіба толькі выкшталцона падаць! — усміхнулася Мар’яна. — Калі ласка, прашу да стала! Але каб пакаштаваць незвычайны пачастунак, яго трэба выйграць!

У млынара ад такіх слоў дачкі вочы сталі па яблыку! Ад жаху небарака здранцвеў і чакаў, што кароль раззлуецца і скажа пакараць іх смерцю. Але ўладар дзяржавы з цікавасцю паглядзеў на дзяўчыну:

— Можа, і выйграю! У што гуляць будзем?

Мар’яна правяла госця да стала. На ім стаяла талерка з суніцамі, два кубкі з малаком і… Сапраўднае дзіва! Пасярэдзіне ляжала квадратная шахматная дошка, на ёй былі расстаўлены снежна-белыя і цёмна-сінія шахматныя фігуры.

— Прапаную партыю! Шахматы і нават дошка — ядомыя. Здымеш з поля пабітую фігуру — можаш яе з’есці!

А за кожную маленькую перамогу будзем падымаць кубак малака і ласавацца суніцамі.

— Якая цудоўная прыдумка! — узрадаваўся кароль. — Наемся я хутка, бо ў шахматы гуляю выдатна! Перажываю толькі, каб паненка галоднай не засталася!

— А я дык за вас, Ваша Вялікасць, хвалююся! — усміхнулася Мар’яна.

І гульня пачалася. Бедны млынар сядзеў паводдаль і штохвілінна выціраў насоўкай узмакрэлы ад нервовага напружання лоб. Першую белую фігуру зняў з дошкі кароль. З вялікім задавальненнем ён адкусіў кавалак і адзначыў:

— Цукровая смаката! Спадарыня млынароўна вырабляе выдатнае печыва і ў шахматы таксама няблага гуляе!

Уладар дзяржавы падняў кубак малака, пакаштаваў суніцы. Потым другая белая фігура дасталася каралю.

— Праўда смачна! Цёмна-сінія я выраблялa з сакавітых лясных чарніц і нашай мукі! — гэта ўжо Мар’яна каштавала шахматную фігуру, ела суніцы і запівала малаком.

Сняданак плаўна перайшоў у абед, шахматныя фігуры елі і на падвячорак. Млынар патроху шчыпаў свой бохан хлеба, піў чабаровую гарбату і хваляваўся, што гульня зацягнецца да ночы. Тады заўтра з раніцы зноў трэба будзе клапаціцца пра якісьці выкшталцоны сняданак.

Бліжэй да вечара партыя скончылася. Выйграла Мар’яна. І зноў моцна перапалохаўся млынар, баючыся каралеўскага гневу. Але дарэмна ён перажываў.

Манарх устаў з-за стала і пранікнёна сказаў дзяўчыне:

— Нічога смачнейшага за гэта дзівоснае печыва і малако з суніцамі не каштаваў я ў сваім жыцці. Ніколі яшчэ не было ў мяне такога цудоўнага дня. Ніводнага разу дагэтуль я не прайграваў у шахматы. А гэта партыя змяніла маё жыццё. Дзякую табе, красуня-млынароўна!

Уладар дзяржавы збіраўся вярнуцца ў свой палац. Мар’яна склала шахматную дошку скрыначкай і насыпала ў яе спелых суніц.

— Гэта вам у дарогу, каб было чым падсілкавацца! — сказала яна госцю.

Так і пайшоў кароль. Пешшу, несучы ў руках выкшталцоны пачастунак.

— Пеpaжылі! — уздыхнуў млынар. — Я думаў, ён нам галовы зніме за такі сціплы прыём. Як ты хораша з шахматамі прыдумала! Але я так напалохаўся, калі ты перамагла! Чаму не дазволіла яму выйграць?

— Каб яму захацелася адыгрconsidering! — падміргнула Мар’яна.

Наступнай раніцай да старога млына на рэчцы пад’ехаў вершнік. Гэта быў кароль. Ён зайшоў у знаёмы дом і звярнуўся да млынара:

— Прашу аддаць за мяне вашу дачку Мар’яну!

Ад такой прапановы ў гаспадара мову адняло. Ён толькі паглядзеў на дачку і кіўнуў. Маўляў, згодна?

Дзяўчына сціпла апусціла доўгія вейкі, хаваючы пад імі свае шчаслівыя вочы. Яе думкі і сэрца штохвілінна былі заняты нечаканым госцем, што завітаў пазаўчора.

Раптам з панадворка пачуўся тупат капыт, гучна загулі трубы, і каралеўскі вяшчальнік аб’явіў:

— Кароль просіць спадара млынара аддаць дачку Мар’яну замуж за Яго Вялікасць!

— Згодны! Аддаю! — вярнулася мова да шчаслівага бацькі.

— Не змог я вытрымаць, прыскакаў хутчэй, чым уся кавалькада! — усміхнуўся кароль, беручы за руку сваю нявесту.

На вяселлі млынар сядзеў побач са старым каралём.

— Шчаслівы мой сын! — радасна ўздыхнуў былы манарх. — Жонка прыгажуня, разумнічка і гатуе цудоўна, усё такое смачнае! Гэта ж я яго навучыў, як нявесту выбіраць! Цяпер у палацы новая гаспадыня, новая кухня. Хоць наемся!

— Хто б ведаў, якія простыя жаданні ў каралёў! — усміхнуўся ў вусы млынар.

А Стэфан і Мар’яна жылі доўга, былі шчаслівыя, цудоўных дзетак выгадавалі і дзяржаву сваю зрабілі яшчэ больш магутнай і прыгожай.

# Шахматная каралева

Было гэта даўно. Стагоддзі мінулі з тых часоў, шмат што ў свеце змянілася, і гісторыя гэтая забылася б, але мне яе нашаптаў цёплы паўднёвы ветрык, а я запісала аповед у свой чароўны нататнік пад бліскучай вокладкай. Не здзіўляйцеся, проста казачніца чуе ў подыху ветру не толькі шум, але і словы. Вось што ён распавёў мне…

Праз адно княства, якое ў старажытныя часы існавала непадалёк адсюль, ехаў кароль з далёкай краіны. Казалі, той кароль быў казачна багаты, але няшчасны, бо нешта ў яго здарылася, таму шукаў ён штосьці ў сваіх вандроўках, ды ніяк не мог знайсці. Кароль ехаў у залатой карэце, а за ім бясконцай чарадой цягнуліся вазы, у якіх слугі везлі розныя рэчы ды куфары з золатам і каштоўнасцямі. Вось у тым княстве, пра якое ўжо згадвалася, і спыніўся заможны вандроўнік. Кароль толькі месца паказаў, і кінуліся слугі гаспадару жытло рыхтаваць. За адзін дзень на маляўнічым лузе каля ракі, непадалёк ад горада палац-шацёр сабралі з таго, што ў вазах з сабою прывезлі. Дываны мяккія паслалі, мэблю паставілі, вячэру згатавалі. Адпачыў кароль, а раніцай у горад пайшоў. Ходзіць па кірмашовай плошчы, прыглядаецца, а гандляры адзін перад адным багатаму пакупніку свае тавары нахвальваюць. Ды толькі той адмоўна хістае галавой, бо ў яго ўсё ёсць.

— Ну з такім пакупнікам анічога не заробіш! — махнуў рукой каваль, які прапаноўваў свае дыхтоўныя вырабы.

— Чаму ж не заробіш? — усміхнуўся кароль. — Кожны з вас можа атрымаць залатую манету ці нават больш.

Усе сцішыліся, прыслухоўваюцца, як золата можна зарабіць.

— Прапаную любому юнаку прыйсці ў мой палац ля ракі і згуляць у цікавую гульню. Хто прайграе — адну манету

атрымае і сыходзіць, а хто выйграе — возьме дзве і зноў паспрабуе згуляць. Дзесяці хлапцам — тым, хто згуляюць лепш за астатніх, я прапаную атрымаць вялікую каштоўнасць. Каму яна дастанецца — будзе багаты і шчаслівы.

Ці трэба казаць, што да каралеўскага палаца-шатра сышліся ўсе маладыя хлопцы таго горада. Ну і каваль выправіўся паглядзець, што за гульня такая ў караля-вандроўніка. Прыйшоў ён апошнім, стаў з краю, назірае, як сотням гульцоў, ахвочых да золата, кароль умовы гульні тлумачыць. Загадаў хлопцам сесці па двое. Уладкаваліся прама на траве, уздоўж рэчкі. Слугі кожнай пары гульцоў прынеслі скрыні, раскрылі іх і паклалі чорна-белымі клеткамі ўверх. На дошкі роўнымі радамі паставілі драўляныя фігуры. Пра шахматы ў гэтым горадзе ведалі, нехта нават гуляць спрабаваў. Вось і каваль умеў, ды толькі не збіраўся абяцаныя каралём манеты вось так атрымаць. Быў з маленства прывучаны працай грошы здабываць, а не гульнёй.

— Сядай, каваль, зарабіць зможаш! — запрасіў кароль.

— Я кавальскай працаю зарабляць звык. Дзякую, Ваша Вялікасць! — адказаў юнак.

Кароль плячыма паціснуў і пачаў тлумачыць правілы гульні тым, хто іх не ведаў. Вельмі хутка палова гульцоў атрымалі па залатой манеце і былі адпраўлены ў горад. Пераможцы паклалі ў кішэні па пары манет, зноў селі па двое і распачалі новую партыю. Праз колькі часу частка менш удалых шахматыстаў атрымалі яшчэ па манеце і развіталіся. У пераможцаў у кішэнях прыемна дзынькала золата, яны апантана распачыналі гульню наноў. Каваль бы ўжо і пайшоў, ды сябра яго над шахматнай дошкай каторую гадзіну сядзеў. Цікава было, ці пройдзе далей. І вось пасля адной з партый засталося дзевятнаццаць гульцоў.

— Гуляем яшчэ адзін раз! — абвясціў кароль. — У апошніх дзесяці пераможцаў будзе магчымасць атрымаць галоўную каштоўнасць, астатнія возьмуць па дваццаць манет і пойдуць. Ды толькі не хапае нам аднаго чалавека…

Юнакі сталі каваля ўгаворваць:

— Браце, згуляй раз!

Кавалю і самому цікава, бо любіў у шахматы гуляць, а тут яшчэ хлопцы так просяць. Пагадзіўся, але адразу папярэдзіў, што золата не возьме. Самай доўгай была гэта партыя. Дзесяць тых, хто прайгралі, узялі абяцаныя манеты і пайшлі. Астатнія дзесяць мелі шанец на галоўную ўзнагароду. Сярод іх быў і каваль.

— Я ўжо багаты! — дзынькаў золатам у кішэні яго сябар. — А вось каб яшчэ вялікую каштоўнасць у дадатак прыхапіць!

— Няхай табе пашанцуе! — усміхнуўся каваль і сабраўся вяртацца ў горад.

— Чакай, хлопча! — прыпыніў яго кароль. — Раз сеў за дошку і стаў пераможцам, то і каштоўнасць атрымаць паспрабуй.

— Я сваю каштоўнасць сам здабуду, — спакойна і ўпэўнена адказаў каваль.

— Калі ты яе зможаш разгледзець, то шчасце знойдзеш! — загадкава прашаптаў кароль.

— Эх, ну цікава ж! Паглядзім, што там за загадка! — усё ж не ўтрымаўся каваль.

— Зараз я запрашу вас у свой палац, — звярнуўся кароль да юнакоў. — Там вы пабачыце некалькі фігур шахматнай каралевы, але толькі адна сярод іх незвычайная. У кожнага з вас будзе магчымасць з першай спробы выбраць менавіта тую, самую-самую. Хто здолее адгадаць, якая з каралеў найкаштоўная, — знойдзе сваё шчасце. Той, хто не адгадае, — атрымае абраную дарагую фігурку на памяць.

— Хто першы будзе выбіраць? — устрывожыліся юнакі. — У таго ж шанцаў болей!

Каваль адразу сказаў, што будзе апошнім, астатнія вызначыліся лёсаваннем. Кароль увайшоў у пакой і загадаў заходзіць па чарзе. І вось першы юнак схаваўся за цяжкай аксамітавай фіранкай, якая закрывала ўваход.

— Ну! Выбірай сваю каралеву! — пачуўся голас караля.

Некалькі хвілін было ціха, потым юнак выйшаў.

— Дыямантавая! Яна мая! — яго вочы зіхацелі хваравітым агнём. — Кароль сказаў, не тая... Ну хай сабе і не тая, але самая дарагая! Я багаты! Багаты!

І ён паспяшаўся ў горад, каб усім паказаць сваё шчасце.

Другі юнак, сябар каваля, выбег з рубінавай шахматнай каралевай:

— Дасканаласць! Яна зроблена з вялікага рубіна! Філігранная праца ювеліра!

У трэцяга была сапфіравая фігурка шахматнай каралевы, у чацвёртага — смарагдавая, у пятага — александрытавая, у шостага — турмалінавая, у сёмага — тапазавая, у восьмага — жадэітавая, у дзявятага — жамчужная...

Каваль з трывогай назіраў, якія прагныя станавіліся вочы ў юнакоў. Ім падабалася валодаць багаццем. І вось надышла яго чарга. Юнак нетаропка падышоў да аксамітавай фіранкі, адхінуў яе і зрабіў колькі крокаў.

Паходні напаўнялі пакой цёплым святлом. Кароль сядзеў у высокім мяккім фатэлі, перад ім стаяў залаты каваны стол, які адразу прыцягнуў увагу хлапца. Круглая ажурная паверхня, па краі аздобленая каштоўнымі камянямі, трымалася на адпаліраванай да зіхацення мармуровай шахматнай фігуры. Яна была асляпляльна-белага колеру і так незвычайна прыгожа пералівалася пяшчотным блакітным зіхаценнем, што каваль загледзеўся.

— Словамі не апісаць гэта хараство... — прашаптаў юнак.

Кароль уважліва ўглядаўся ў хлопца:

— Што ж, твая чарга выбраць сабе шахматную каралеву!

Гаспадар палаца адкінуў вечка залатога куфра, які стаяў на стале, — і з-пад яго заззяла казачнае полымя, мяккім святлом заліло пакой. Гэта былі шахматныя каралевы, выраблены з розных каштоўных камянёў. Фігуркі прамяніліся каляровымі агеньчыкамі, вабілі да сябе.

— Ну, якую каралеву выбіраеш? — запытаўся кароль.

— Вось гэту! — усхвалявана адказаў каваль.

Юнак не мог адвесці ад яе вачэй. Ён зрабіў крок, потым яшчэ адзін, укленчыў і працягнуў руку да белай мармуровай фігуры шахматнай каралевы, якая займала самае пачэснае месца за сталом.

— Чаму не ўзяў каралеву з дыямента, ці смарагда, альбо сапфіра? — голас караля дрыжаў.

— Я іх і не заўважыў, — прашаптаў юнак. — Вось сапраўдная каралева! У яе блакітным зіхаценні таямніца, якую я павінен разгадаць. Ваша Вялікасць, аддайце мне яе!

— Шчаслівы дзень надышоў! — прашаптаў кароль і гучна дадаў: — Аддаю табе тую каралеву, якую ты выбраў… Сапраўдную!

У той жа момант у палацы-шатры бліснула асляпляльная маланка і гром грымнуў так аглушальна, што не вытрымала белая мармуровая фігура і рассыпалася на мільёны аскепкаў, а залатая ажурная паверхня стала расплавілася і заструменілася павольным вадаспадам, губляючы бліскучыя камяні-каштоўнасці, якімі была аздоблена.

Перад агаломшаным кавалём не было больш мармуровай белай каралевы, перад ім з каменных аскепкаў узнікла дзівосна прыгожая дзяўчына. Юнак не мог вачэй адвесці ад красуні, якая стаяла побач з ім, сціпла апусціўшы вочы. Кавалю здавалася, раней ён ужо бачыў яе, але дзе? У снах? У марах? Тонкая белая скура, залатыя валасы, светлая сукенка, расшытая каштоўнымі камянямі. Прыгажуня падняла доўгія цёмныя вейкі, і юнак убачыў пяшчотны позірк яе вачэй. Вось яна, таямніца блакітнага зіхацення, якую так прагнуў адкрыць каваль…

— Дачушка мая! Знайшоўся твой суджаны! Чары зніклі! — сказаў кароль і злучыў рукі юнака і дзяўчыны.

Тым вечарам справілі заручыны — меўся каваль Яўхім стаць зяцем каралю. Вось за святочнай вячэрай і расказаў кароль, што за цуды з громам і маланкай адбываліся ў палацы-шатры.

…Тры гады таму прыехаў да караля заможны князь, уладар суседніх земляў. Ведаў кароль, што князь той вядзьмак! Справы з ім мець не хацеў аніякай, але ж запрасіць няпрошанага візіцёра ў палац абавязвала гасціннасць. Сустрэў гаспадар госця, раскошную вячэру зладзіў, у шахматы пагуляць запрасіў. Пакуль партыю вялі, сказаў князь, што хоча ажаніцца з дачкой караля. Як пачула гэта юная каралеўна Аладэя, то ледзь прытомнасць не страціла. Усхваляваўся і бацька, бо, зразумела, не хацеў аддаваць за такога жаніха сваю дачушку. Адмовіў! Параіў з іншых прынцэс-прыгажунь выбраць. Раззлаваўся вядзьмак, схапіў з шахматнай дошкі фігурку каралевы і наслаў страшны праклён:

— Была б твая дачка сапраўднай каралевай, каб за мяне замуж пайшла, але раз адпрэчылі, то няхай нікому не дастанецца! Стане яна каралевай, толькі… шахматнай!

Вядзьмак так моцна сціснуў у далоні шахматную фігурку, што яна ператварылася ў аскепкі, а потым ён павярнуўся да каралеўны і садзьмуў іх на яе. На вачах агаломшанага бацькі Аладэя застыла белай мармуровай фігурай, залатыя валасы дзяўчыны падняліся ўверх і звіліся па крузе, каштоўныя каменьчыкі з яе ўбору ляглі па краі. Яшчэ адзін умольны погляд блакітных вачэй глянуў з мармуровай фігуры на бацьку — і замест дачкі перад ім ужо стаяла белая каменная шахматная каралева з блакітным водбліскам і прычоскай, што заплялася над каронай ажурным золатам.

Кінулася варта, каб схапіць князя, але ён спыніў іх адным рухам рукі — моцных волатаў нябачная сіла адштурхнула і да сцяны прыціснула. І на караля абсалютнае здранцвенне найшло.

— Хацеў іншага жаніха сваёй дачцэ? Нікому яна цяпер не патрэбная! — агідна рассмяяўся вядзьмак.

Кароль крычаць хоча, а голас прапаў — ні гука не вымавіць, толькі вуснамі варушыць.

— Не чую! Аб літасці просіш? — здзекаваўся вядзьмак. — То добра! Шукай сваёй дачцэ жаніха сярод тых,

хто ў шахматы выдатна гуляе. Зладзь турнір, а потым хоць сабе і дзясятку пераможцаў пакажы сваю шахматную каралеўну, але побач з ёю пастаў фігуркі дыяментавых, сапфіравых, рубінавых каралеў. Ты ж мне прапанаваў з іншых прыгажунь выбраць! І вось, калі знойдзецца той, хто сярод такіх каштоўных разгледзіць і абярэ мармуровую, сапраўдную, закляцце знікне — і дачка твая зноў дзяўчынаю стане. Я нават абяцаю ніколі больш вас не турбаваць!

І, перакінуўшыся ў вялізнага крумкача, князь вылецеў праз акно.

Неадкладна загадаў кароль ювелірам рабіць фігуркі шахматных каралеў з дыяментаў, сапфіраў, рубінаў і паехаў па свеце з надзеяй знайсці таго, хто зможа разгледзець закаваную ў мармур сапраўдную каралеву сярод каштоўных шахматных фігур. Шмат турніраў зладзіў, але ўсе пераможцы, што падыходзілі да стала, бачылі толькі куфэрак з каштоўнасцямі, на сапраўдную каралеву ніхто і позірк не кінуў.

— Як здолеў ты, каваль, заўважыць яе? — напрыканцы свайго аповеду запытаўся кароль.

— І ў халодным бляску белага мармуру я ўбачыў таямнічы погляд дзівосных блакітных вачэй, — прашаптаў юнак.

Так паядналіся лёсы прыўкраснай каралеўны Аладэі і шчырага сэрцам каваля Яўхіма. Закаханыя ажаніліся, а кароль нарэшце суцешыўся, перадаў маладым каралеўства і паехаў па свеце, бо вельмі палюбілася яму вандраваць.

**Змест**


Загадка прынцэсы Агнэсы
Пачастунак для Яго Вялікасці
Шахматная каралева

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ Кацярына Станіславаўна**

# ШАХМАТНАЯ КАРАЛЕВА

Казкі

Рэдактар
*Т. М. Якаўлевіч*

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
*Л. У. Гатавіцкая*

*У дызайне вокладкі выкарыстаны малюнак*
*Анастасіі Балыш*

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by